## *2. Взаимодействие Церкви с государственными органами и организациями, средствами массовой информации в сфере духовно-патриотического воспитания общества и социального служения*

**П. Ю. Булаты**
Установа адукацыі «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы», Мінск

# ЗАХАВАННЕ ЎЗОРАЎ КУЛЬТУРНА-ГІСТАРЫЧНАЙ СПАДЧЫНЫ ЯК ФОРМА САЦЫЯЛЬНАГА СЛУЖЭННЯ ЦАРКЫ

У сучасным свеце Царква з'яўляецца неадменнаю часткай складанавыбудаванай сістэмы сацыяльных узаемаадносін. Розныя сацыяльныя праблемы існавалі на ўсіх этапах развіцця грамадства і вырашаліся яны па-рознаму. У беларускай гісторыі не апошняя роля ў вырашэнні сацыяльных праблем адводзілася Царкве, якая стварала і развівала разнастайныя формы сацыяльнай працы. Перад усім у мінулым пад сацыяльнай царкоўнай працай і сацыяльным служэннем разумелася справа ў дапамозе бяздольным і тым, каго спасцігла нэндза і патрэба: гісторыя беларускай Царквы насычаная прыкладамі дабрадзейства. У часы Сярэднявечча і Мадэрна пры цэрквах закладаліся шпіталі, дзейнічалі брацтвы. Адзначаецца актыўнасць Царквы ў сацыяльным служэнні і ў XIX стагоддзе. Служэнне Царквы ў незалежнай Беларусі (забароненае і перарванае за часамі савецкай улады) цягам апошніх дзесяцігоддзяў адрадзілася. Сацыяльная праца Царквы перажывае новы этап свайго развіцця і набывае новыя формы, абумоўленыя ўзроўнем развіцця грамадства і агульна прынятымі тэндэнцыямі.

Безумоўна, галоўнай формай сацыяльнага служэння Царквы ў наш час застаецца традыцыйная форма, а менавіта – дапамога тым, хто знаходзіцца ў складанай жыццёвай сітуацыі. Спантанныя ініцыятывы, якія ўзнікалі ў 1990-х у асяроддзі актыўных святароў і міран у сацыяльнай сферы паступова набываюць ясныя структурныя формы. На епархіяльным і парафіяльным узроўні рэалізуецца мноства сацыяльных праектаў, у рамках якіх вядзецца праца з залежнымі, бяздомнымі, пажылымі і моладдзю, інвалідамі і г.д. Святар ужо даўно перастаў быць «дзівоцтвам» у бальніцах, дзіцячых дамах, месцах зняволення – там, дзе патрабуецца падтрымка. Для таго каб сацыяльная праца на зводзілася да фармальных дзеянняў, але рэальна дапамагала рэалізацыі прынцыпаў дабрачыннасці ў сучасных умовах, у царкоўным асяроддзі ўдзяляецца шмат увагі павышэння якасці гэтай працы. У сувязі з гэтым і пад уплывам сацыяльна-эканамічных умоў практыка сацыяльнага служэння пераасэнсоўваецца, адбываюцца захады па адмове стэрэатыпаў і прыняццю новых стратэгій. Менавіта хрысціянскае разуменне служэння бліжняму ў кантэксце духоўна-маральных традыцый беларускага народа з'яўляюцца фундаментальнай асаблівасцю сацыяльнай работы ў нашай дзяржаве. Цяпер з'явілася магчымасць вярнуцца да традыцыйных хрысціянскіх каштоўнасцей каб па-новаму вызначыць змест сацыяльнай працы. Сучасныя сацыяльна-эканамічныя прыярытэты даюць магчымасць ўвасобіць ідэі сацыяльнага служэння, якія засноўваюцца на хрысціянскіх традыцыях беларускага народа.

Ва ўмовах сучасных тэндэнцый развіцця грамадства вылучаецца такая форма сацыяльнага служэння Царквы, як захаванне культурна гістарычнай спадчыны. Абумоўлена гэта важнай роляй, якую адыгрывае спадчына, у тым ліку і царкоўная, ў жыцці грамадства.

Царкоўная гісторыка-культурная спадчына народа Беларусі, створаная ім у розныя гістарычныя перыяды, з'яўляецца не толькі яго здабыткам, але і неад'емнай часткай дасягненняў ўсяго чалавецтва. Духоўныя, мастацкія і дакументальныя каштоўнасці беларускіх цэркваў уплываюць на інтэлектуальнае, духоўнае і эканамічнае развіццё беларускага грамадства. Асабліва варта падкрэсліць значнасць і ўнікальнасць спадчыны, створанай у часы Вялікага Княства Літоўскага: прыклады царкоўных здабыткаў таго часу адметны сваёй рэдкасцю і самабытнасцю. Для любога народа захаванне царкоўнай культурнай спадчыны важна па трох прычынах:

па-першае, гісторыка-культурная спадчына істотна ўздзейнічае на свядомасць і самасвядомасць людзей, дазваляе ім адчуць сваё дачыненне да культурнай традыцыі многіх пакалення;

па-другое, гісторыка-культурная спадчына з'яўляецца досыць аб'ектыўным сведчаннем мінулага;

па-трэцяе, гісторыка-культурная спадчына – гэта частка матэрыяльнай і духоўнай культуры, створаная, захаваная і перададзеная сучаснікам як нешта ўшанаванае і ўнікальнае, як нязменная каштоўнасць.

Захаванне і прымнажэнне гісторыка-культурных каштоўнасцей мае выключна важнае значэнне для развіцця нацыянальнай культуры беларускага народа. Дзяржава гарантуе захаванасць і абарону гісторыка-культурнай спадчыны не толькі карэннай нацыі, але і ўсіх нацыянальных і рэлігійных супольнасцей, якія пражываюць у Рэспубліцы Беларусь.

Каштоўнасць аб'екта культуры вызначаецца яго сацыякультурнай значнасцю. Каштоўнымі для чалавека з'яўляюцца тыя матэрыяльныя і духоўныя прадметы і з'явы, якія здольныя падахвочваць яго да актыўнай дзейнасці і надаваць ёй сэнс. Каштоўнасці арыентуюць чалавека ў свеце, накіроўваюць яго паўсядзённую дзейнасць. Зыходзячы з каштоўнасцей, чалавек вызначае для сябе прыярытэты ўласнай жыццёвай стратэгіі. Ўяўленні чалавека пра каштоўнасці фармуюцца на аснове пэўных сацыяльных і духоўных традыцый. Важнасць царкоўных культурных каштоўнасцей як фактару развіцця чалавецтва вызначаецца міжнароднай супольнасцю, а таксама Царквой. Так, у «Положении о должности епархиального древлехранителя», якое



Репозиторий БарГУ

было прынята на пасяджэнні Святога Сіноду 25 снежня 2014 г. адзначаецца: «Сохранение и передача грядущим поколениям бесценного духовного наследия Русской Православной Церкви, запечатленного в памятниках архитектуры, иконописи, произведениях изобразительного и ювелирного искусства, скульптуры, всегда было очевидной и насущной задачей Церкви [1]».

Сярод багатай царкоўнай спадчыны, сярод іншага (архітэктура, кнігазборы, літургічнае начыненне) варта вылучыць узоры іканапісу. Абранне менавіта гэтага віду спадчыны не выпадковае. Як адзначае культуролаг Юлія Чарняўская, супольнасцю асаблівая ўвага надаецца лепшым творам мастацтва і прадметам цывілізацыі, якія былі створаныя за шматлікія стагоддзі, але захавалі свой статус каштоўнасці і ў сучаснасці працягваюць ўдзельнічаць у жыцці чалавецтва. Новае пакаленне ніколі не пераймае ўсіх элементаў мінулага, а толькі выбарачныя, папярэдне падвергнутыя каштоўнаснай праверцы. Часцяком элементы культурнай спадчыны абіраюцца ў якасці класічных толькі ў адпаведнасці з іх прыдатнасцю да сучаснасці. Такі падыход шмат у чым і вызначае паняцце класікі, пад якой разумеецца зацвярджэнне адабраных з культурнай спадчыны узораў, якія прымаюцца прадстаўнікамі культуры дадзенага этнасу ў якасці абсалютнай вартасці як арыентыры далейшага развіцця і меркі новаствараемых культурных, грамадскіх і асобасна-чалавечых каштоўнасцей. У розныя эпохі такую ролю адыгрываюць розныя элементы і складнікі класічнай культурнай спадчыны, але ўся гэта спадчына ў цэлым заўжды застаецца той скарбніцай, з якой, кожная па сваім, бярэ свае эталоны і арыенціры наступная гістарычная эпоха. Класічны фонд культурнай спадчыны дадзенага этнасу, узяты ў цэлым, і вызначае духоўную стабільнасць дадзенага этнасу і, шмат у чым, кірунак яго далейшага развіцця. Класічная спадчына поліфункцыянальная, а галоўная яе функцыя акрэсліваецца як стабілізацыя культурных дасягненняў, захаванне культурных пазіцый ва ўмовах іх паслаблення, фарміраванне стылёвай самаідэнтыфікацыі, апраўданне змен у грамадстве і вылучэнне сферы быцця, памкненняў і поглядаў, якія не могуць знайсці сваё месца ў сучаснай рэальнасці [2].

Здабыткі іканапісу вылучаюцца на падставе іх практыкапрымяняльнасці, што дазваляе далучыць іх да катэгорыі «класіка». Так, у сваёй большасць узоры іканапісу захоўваюцца ў прыходскіх храмах тых мясцовасцей, дзе былі створаны. Хоць творы іканапіснага мастацтва змяшчаюцца таксама і ў фондах і калекцыях музеяў, аднак, у параўнанні з такім відам царкоўнай спадчыны як кнігазборы (старажытныя асобнікі захоўваюцца пераважна ў бібліятэках і музеях; у літургіях амаль не выкарыстоўваюцца), царкоўныя абразы знаходзяцца ў месцах свайго натуральнага і асяроддзя і выконваюць функцыя, акрэсленыя хрысціянскай традыцыяй. Дазваляе далучыць царкоўныя абразы да класікі і трывалая нязменнасці твораў іканапіснага мастацтва. У адрозненні ад помнікаў храмавай архітэктуры, на знешні выгляд якіх уплываюць фактары знешняга асяроддзя (перад усім, палітычна-ідэалагічныя: з сяр. XIX стагоддзя на Беларусі назіраецца тэндэнцыя перабудовы храмаў і змяненне іх архітэктурна-стылістычнага аблічча шляхам надання будынкам неўласцівых іх першапачатковай стылістыцы элементаў іншых архітэктурных плыняў), узоры іканапісу застаюцца амаль нязменнымі цягам некалькіх стагоддзяў.

На канкрэтным прыкладзе – прыкладзе ўнікальных узораў іканапісу з царквы Святога Духа ў вёсцы Вялікае Падлессе (Ляхавіцкі раён) разгледзім, як Царква выконвае форму сацыяльнага служэння па захаванню культурна-гістарычнай спадчыны.

Спачатку акрэслім гістарычныя перадумовы ўзнікнення іканапіснага збору, адзначыўшы галоўныя этапы развіцця прыходу ў вёсцы Вялікае Падлесся. Галоўная версія ўзнікнення прыходу, якая распаўсюджана ў сучаснай літаратуры, прыводзіцца ў «Апісанні цэркваў і прыходаў Мінскай епархіі» за 1878 г. дзе паведамляецца наступнае: «Первоначальное построение в сей местности церкви приходится в связи с двумя фактами: явление местно-чтимой иконы Пресв. Богородицы и наделом земли, для содержания причта новоучреждаемой в то время в селе Подлесье церкви. (*Пасля з'яўлення іконы – аўт.*) жители села Подлесья, наскоро построили на месте явления иконы дощатый шатёр, а немедленно затем деревянную часовню. Впоследствии, Мстиславский воевода, Георгий Сапега, во время тяжкой болезни, дал обет построить здесь церковь, и, совершенно выздоровев, ходил пешком на поклонение сей иконе Богоматери, потом построил деревянную церковь и на содержание причта ей, в 1637 г. записал 3 уволоки земли [3, с. 199]». Аднак прыведзеная вышэй версія не зусім адпавядае рэчаіснасці. Справа ў тым, што ў абазначаным у тэксце 1637 годзе Ляхавіцкім маёнткам, у склад якога ўвесь час уваходзіла вёска Вялікае Падлессе [4, с. 75], валодаў не Георгі Сапега, а падканцлер літоўскі Казімір Лявон Сапега. Мсціслаўскі ваявода ж Георгі Феліцыян Сапега ўладарыў Ляхавіцкім графствам з 1686 па 1750 год [5, с. 43]. Прыведзеная ў «Апісанні цэркваў…» версія запісвалася са слоў мясцовых жыхароў, што адзначана і ў самім дакуменце. Праўдападобна, што адбылася пэўная блытаніна з датамі альбо імёнамі. На нашу думку, памылковай з'яўляецца менавіта дата: 1637 г. На карысць гэтага сведчаць акты царкоўных візітацый Цырынскай пратапопіі за 1680 г., дзе звесткі адносна царквы ў Падлессі адсутнічаюць [6]. На нашу думку, у Падлессі Г. Сапегам у XVIII ст. у Падлессі была ўзведзеная капліца, якая захавалася да нашага часу і носіць імя нябеснага патрона графа Сапегі – Святога Георгія. Там захоўваецца драўлянае распяцце, якое датуецца XVIII ст.

Адносна з'яўлення царкоўнага прыходу ў Вялікім Падлессі зазначым наступнае. Па словах гісторыка Дзяніса Лісейчыкава, які спасылаецца на акты царкоўных візітацый, прыход у Вялікае Падлессе быў перанесены з Ляхавічаў у кан. XVIII ст. (ужо ў 1771 г. згадваецца царкоўны служка з Падлесся Іосіф Данцэвіч) [7]. Гэта тлумачыць і наяўнасць помнікаў іканапісу XVII ст., якія захаваліся ў царкве да нашага



Репозиторий БарГУ

часу. Сам жа будынак Падлескай царквы быў узведзены ў 1818 годзе [8, с. 337]. У «Апісанні цэркваў…» адзначаецца, што, згодна з мясцовай легендай, будынак царквы быў узведзены «управителем имения Старо-Ляхович, который, будучи уносим испуганною лошадью, в момент опасности обратился мысленно к Подлеской иконе Богоматери, дав обет построить новую церковь, после чего мгновенно лошадь остановилась и жизнь погибавшего уцелела [3, с. 199]».

Сам будынак царквы, як адзначае мастацтвазнаўца Тамара Габрусь, з’яўляецца помнікам традыцыйнай драўлянай культавай архітэктуры з элементамі класіцызму. Будынак складаецца з прамавугольнага ў плане галоўнага аб’ёму і выцягнутай пяціграннай апсіды, да якой прыбудаваны невялікія рызніцы. Усе аб’ёмы аб’яднаныя двухскатным гонтавым дахам. Галоўны заходні фасад аформлены шасцікалонным порцікам, які завяршаецца франтонам у форме трапецыі. Порцік і апсіду вянчаюць гранёныя фігурныя вежачкі. Сцены царквы вертыкальна ашаляваныя, фарбаваныя ў блакітны колер (у 1878 г. дах меў чырвоны колер, а сцены – жоўты [3]), умацаваныя брусам і прарэзаныя прамавугольнымі аконнымі праёмамі. Дзвярны праём мае напаўцыркулярнае завяршэнне. Інтэр’ер храма зальны, перакрыццё брусавае з падшытай столлю. Над уваходам змяшчаюцца хоры, упрыгожаныя балюстрадаю [9, с. 290].

Да нашага часу ў Падлескай царкве Святога Духа захаваліся цудоўныя прыклады беларускага іканапісу XVII ст. Іканапіс і сакральны жывапіс Беларусі гэтага перыяду, па словах мастацтвазнаўцы Н. Высоцкай, уяўляе сабою арыгінальную з’яву еўрапейскай культуры. Ён развіваўся адначасова з манументальным і свецкім мастацтвам і захаваў дзве магутныя галіны еўрапейскай культуры: іканапіс і алтарны жывапіс, які існаваў ва ўзаемаўплыве і ўзаемаўзбагачэнні, што не мае прамых аналогій у мастацтве Заходняй і Усходняй Еўропы і караніцца ў гістарычных асаблівасцях развіцця Беларусі, размешчанай на стыку лацінскага захаду і праваслаўнага ўсходу, што ў сваю чаргу спрыяла ўзнікненню цесных сувязей мастацтва як з візантыйскай, так і з заходнееўрапейскай культурай. У агульным ходзе фарміраванні беларускай народнасці, мовы, культуры ў XIV–XVI ст. адбываўся працэс станаўлення мясцовай школы жывапісу, што адыграла вызначальную ролю ў развіцці мастацтва наступных стагоддзяў. У Беларусі, як і ў шэрагу краін Заходняй Еўропы, з канца XVI ст. і амаль да канца XVIII ст. вядучым стылістычным напрамкам у архітэктуры і мастацтве было барока. Станаўленне яго ў Беларусі адбываецца раней, чым ва ўсіх заальпійскіх краінах, і па часу амаль супадае з мастацтвам маньерызму ў Італіі. Хуткае засваенне новай стылістыкі ў Беларусі адбылося таму, што, з аднаго боку, пры захаванні візантыйскіх і мясцовых асноў развіваліся раманскі, гатычны стылі, Рэнесанс, а з іншага боку – у самой паўночна-ўсходняй Італіі ў V–XV ст. былі досыць моцныя візантыйскія традыцыі пры аслабленых рысах раманскага стылю і готыкі. Так, у Беларусі склалася ўнікальная сітуацыя, пры якой адбылося арганічнае спалучэнне еўрапейскай стылістыкі, якая паслядоўна развівалася, з візантыйскімі вытокамі, мясцовымі традыцыямі, што спрыяла сцвярджэнню паўночнаітальянскага варыянта барока, які ў далейшым выліўся ў фарміраванне ўласнай нацыянальнай школы ў архітэктуры і іншых відах мастацтва [10].

Наяўнасць у Падлессі адметных абразоў высокамастацкай вартасці («замечательных по древности и редкости живописи» [3, с. 200]) падкрэсліваецца ў дакументах XIX ст.. Паведамляецца як пра абразы з іканастасу, так і насценныя. Прыведзеныя ўзоры іканапісу захаваліся і да нашага часу. Разглядзім іх падрабязней.

Галоўнай мастацкай перлінай у падлескім іканапісным зборы з’яўляецца абраз Маці Божай Падлескай, які лічыцца цудадзейным. Легенда, звязаная са з’яўленнем абраза прыводзіцца ў «Гістарычна статыстычным апісанні Мінскай епархіі» за 1864 г., дзе адзначаецца, што «по местному приданию она явилась на камне подле креста, стоявшего близ дороги из села Подлесья в деревню Заритов, некоторой проходившей здесь и прозревшей слепорожденной девице [11, с. 72]». Адзначаецца, што па стане на 1864 г. звестак адносна цудаў ад іконы не захавалася, але пазначана, што ў гонар іконы быў складзены гімн на польскай мове невядомым аўтарам []. З мастацкай кропкі погляду дадзены абраз датуецца XVII ст. Выканана іконы ў тэхніцы тэмпера на дубовай дошцы з залатым фонам і памерам 107х93 см. Абраз агорнуты ў залачоную шату (аклад немаўляткі Ісуса срэбны) з залачонымі каронамі [12]. Гэтая ікона, якая, як іншыя старажытныя абразы, першапачаткова знаходзілася ў Ляхавіцкай царкве, аб чым сведчыць акт візітацыі 1680 г. Адзначаецца, што ў царкве знаходзіцца абраз Божай Маці, які пры сабе ўтрымлівае шэраг вотаў. Сярод іншых ахвяраванняў на іконе адзначаюцца: тры вялікія срэбныя таблiцы, тры ручкі, два паўмесяцы, тры сэрца, дваццаць малых таблічак, пяць срэбных крыжыкаў, два срэбных кулоны апраўленых у крышталь і адзін бурштынавы ў срэбнай аправе, двое караляў (адны з перлін), маленькая срэбная зорка, пакрыты срэбрам пасак, тасьма залатая. Гэта дае падставы лічыць згаданы абраз цудадзейным і шанаваным [6].

Сярод падлескіх абразоў знаходзіцца прастольны абраз былой Ляхавіцкай царквы Святога Георгія – ікона «Цуд Юрыя». Абраз XVII ст. выкананы ў тэхніцы тэмпера на сасновай дошцы памерам 109х75 см. і адметны сваім маляўнічым каларытам і насычанасцю фарбаў [12]. Ідэал праведнасці і добразычлівасці – не фанатычны, не пакутніцкі, але вельмі чалавечны і гуманны – адлюстраваны ў іконе 1683 г. «Тры святыцелі. Васіль Вялікі, Іаан Багаслоў, Ян Залатавуст», выкананай на хваёвай дошцы памерам 108х81 см. у тэхніцы тэмпера. Агульны цёплы каларыт іконы і залацісты разьбяны фон з бутонамі лілей падкрэсліваюць спакойную і мудрую святочнасць ладу [12].

У апісанне царквы за 1879 г. змяшаюцца звесткі адносна царкоўнага іканастасу. Адзначаецца, што ён новага ўстройства, драўляны і змяшчае 7 абразоў старога пісьма, а 5 – новага. Дадзеная мадэль іканастасу

Репозиторий БарГУ

захавалася да нашага часу (прадстаўлена на малюнку ніжэй). Праўдападобна, што, ствараючы яго ў XIX ст., выкарыстоўваліся абразы, якія прысутнічалі ў царкве і раней. Як адзначаюць мастацтвазнаўцы Эльза Максіма і Вольга Церашчатава, абразы з Падлесся надзвычай самабытныя і выкананыя на высокім прафесійным узроўні. Прычым манера выканання вельмі адрозніваецца ад паўднёвапалескай. Гэта дае падставы меркаваць, што недзе ў наваколлі, а магчыма ў саміх Ляхавічах (як цэнтры буйнога маёнтка, які належаў прадстаўнікам магнатэрыі ВКЛ), існавала мастацкая майстэрня [12].




**Мал. 1 – Схема іканастасу царквы Святога Духа ў вёсцы Вялікае Падлессе**

У царкве знаходзяцца таксама два бакавыя драўляныя, дэклараваныя разьбою алтары кан. XVIII ст., у якіх, аднак, змяшчаюцца іконы XIX ст. Апроч твораў іканапісу варта зазначыць наяўнасць у царкве карцін на біблейскую тэматыку: Страшны Суд і Суд над Хрыстом (на датаваныя).



**Мал. 2 – Царкоўныя абразы Свята-Духава храма XVII ст.: Божая Маці Падлеская; «Цуд Юрыя»; «Тры Свяціцелі» [10].**

Репозиторий БарГУ

У Падлескім прыходзе ўзоры іканапісу аберагаюцца вельмі пільна і стаўленне да іх вельмі педантычнае, у мясцовых жыхароў іконы знаходзяцца ў вялікай пашане. Аднак без шчыльнага ўзаемадзеяння з іншымі структурамі, а перад усім органамі мясцовай улады, захоўваць такія каштоўныя ўзоры іканапісу было б досыць складана. Таму прыход падтрымлівае дастаткова шчыльныя стасункі з іншымі функцыянальнымі структурамі, якія дапамагаюць у справе захавання культурна-гістарычнай спадчыны.

Такім чынам, разгледзеўшы на канкрэтным прыкладзе справу па захаванню Царквой узораў культурна-гістарычнай спадчыны, можам зазначыць. У сучасным свеце сацыяльнае служэнне Царквы не абмяжоўваецца выключна яго класічнымі формамі, а пад уплывам фактараў знешняга асяроддзя і грамадскіх тэндэнцый з'яўляюцца новыя формы. Зберагание і ўшанаванне ўзораў старажытнага іканапісу адыгрывае важную ролю ў фармаванні нацыянальнай і рэлігійнай ідэнтычнасці, што спрыяе ўмацаванню традыцыйных каштоўнасцей у грамадстве. Важна, каб у царкоўных прыходах усведамлялася роля спадчыны і працэс яе захавання разглядаўся менавіта як сацыяльнае служэнне. Так Царква зможа захаваць свае здабыткі, якія накопліваліся чалавецтвам цягам стагоддзяў. Дачыненне да царкоўнай культурнай спадчыны ўзбагачае чалавека, пашырае яго магчымасці і перакладае яго ўзаемадзеянне з Царквой і навакольным светам на якасна іншы ўзровень.

**Спіс цытаваных крыніц**


1. Положение о должности епархиального древлехранителя [Электронный ресурс] – Режим доступа: http://www.patriarchia.ru/db/text/3891562.html – Дата доступа: 25.10.2016
2. Чернявская, Ю. Народная культура и национальные традиции [Электронный ресурс] – Режим доступа: http://www.gumer.info/bibliotek_Buks/Culture/Chern/14.php – Дата доступа: 25.10.2016
3. Описание церквей и приходов Минской епархии 1878/79 гг. – Минск, 1879.
4. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Ляхавіцкага раёна / Бел. Сав. Энц. Рэдкал.: І.П. Шамякін (гал.рэд) [і інш.]. – Мн.: БелСЭ, 1989. – 439 с.
5. Грыцкевіч, А // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Ляхавіцкага раёна / Бел. Сав. Энц. Рэдкал.: І.П. Шамякін (гал.рэд) [і інш.]. – Мн.: БелСЭ, 1989. – С. 42 – 47.
6. Візіты уніяцкіх цэркваў Мінскага і Навагрудскага сабораў 1680–1682 гг.: Зб. дак-таў / Склад. Д.В. Лісейчыкаў. – Мінск: І.П. Логвінаў, 2009.
7. Лісейчыкаў, Д.В. Святар у беларускім соцыуме : прасапаграфія ўніяцкага духавенства 1596-1893 гг. / Дзяніс Лісейчыкаў. – Мінск : Беларусь, 2015 – 719 с.
8. Габрусь, Т.В. Сакральнае дойлідства Беларусі: 1000-гадовая спадчына / Т.В. Габрусь. – Мінск : Беларуская навука, 2014. – 483 с.
9. Свод памятников истории и культуры Белоруссии. Брестская область / АН БССР, Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора. – Минск : БелСЭ, 1990. – 424 с.
10. Высоцкая, Н.Ф. Уводзіны / Н.Ф. Высоцкая // Іканапіс і алтарны жывапіс Беларусі XII–XVIII стагоддзяў. – Мінск : "Беларусь", 2012. – 231 с.
11. Историко-статистическое описание Минской епархии. – С. Петербург, 1864.
12. Максімава, Э., Церашчатава, В. Тры свяціцелі, палескі вадзянік і залатыя лісты аканта / Эльза Максімава, Вольга Церашчатава // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Ляхавіцкага раёна – Мн. : БелСавЭн, 1989. С.100 – 107.



**А. И. Веренич**
Минская духовная академия имени святителя Кирилла Туровского, Минск


## ПОНЯТИЕ О БОГОДУХНОВЕННОСТИ СВЯЩЕННОГО ПИСАНИЯ

Несомненно, для успешной работы и развития духовного просвещения и сотрудничества Церкви и государства в сфере библиотечной деятельности, необходимо наличие в библиотеках качественной духовной литературы. И, прежде всего, необходимо наличие главного источника духовного просвещения человека – Священного Писания (Библии).

Главной особенностью Библии, отличающей её от других литературных произведений, придающий ей непререкаемый авторитет, выступает её богодухновенность. Под ней понимается то сверхъестественное, Божественное вдохновение, которое возводило писателей Священного Писания к высшему совершенству, предохраняло от ошибок, сообщало откровения, руководило всем ходом их работы, благодаря чему эта работа была не продуктом человека, а как бы произведением самого Бога. Это является одной из главных истин нашей веры, побуждающей всех верующих признавать книги Библии богодухновенными [1, с. 25].

Впервые этот термин был употреблен апостолом Павлом в его 2-м послании к Тимофею: ***«Все Писание богодухновенно» (2 Тим. 3:16).*** В другом месте уже апостол Петр говорит: ***«Никогда пророчество не было произносимо по воле человеческой, но изрекали его святые Божии люди, будучи движимы Духом Святым» (2 Петр. 1:21).***

Богодухновенность священных книг не уничтожала личных, природных особенностей их авторов. Господь не подавляет свободную волю человека. ***«И духи пророческие послушны пророкам» (1 Кор. 14:32)***, – говорит апостол Павел. Поэтому в содержании священных книг, в их изложении, стиле, языке, характере образов и выражений наблюдаются различия между отдельными книгами Священного Писания, которые зависят от индивидуальных, литературных особенностей их авторов [1, с. 26].